Цана 10 кап. (грош.)

Пролетары! ўсіх краін, еднайцеся!

Орган Часовага Упраўлення гор. Вільно

ВІЛЕНСКАЯ ПРАЎДА

№ 10
3 кастрычніка 1939 г.
Аўторнік

Арганізаваць раздачу панскай зямлі

17 верасня 1939 года — самая радасная дата для працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. У гэты дзень геральная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія перайшла граніцу, каб узяць пад ахову жыццё і маемасць адзінакроўных братоў — беларусаў і украінцаў.

Наш народ, народ вялікага, неабсяжнага Совецкага Саюза па даў сваю моцную руку дапамогі працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Зараз яны назаўсёды вырваны з пад цяжкага ярма эксплаатацыі і нацыянальнага бяспраўя.

У гарадах, мястэчках, вёсках настала кіпучае, радаснае жыццё. У вёсках ствараюцца сялянскія камітэты, якія распачалі вялікую і адказную работу. Яны разрушаюць сістэму памешчыцкага землякарыстання, раздаюць панскую зямлю сялянам, надзяляюць батракоў і беднякоў каровамі, забяспечваюць іх насеннем.

Асабліва вялікую работу ў справе раздачы панскай зямлі зрабіў Сялянскі Камітэт вёскі Порплішча Дзісненскага павета. Старшыня камітэта таварыш Слізень разам са сваімі членамі арганізаваў бесперабойную раздачу панскай зямлі працоўным сялянам. Апрача зямлі, Порплішчцкі Сялянскі Камітэт арганізаваў раздачу батракам і беднякам панскіх кароў. Раздае таксама і насенне для сяўбы.

Добра таксама арганізавана работа па раздачы панскай зямлі ў вёсцы Міхалішкі Віленска-Трокскага павета. Тут старшыня сялянскага камітэта таварыш Петрашыцкі разам з 9 членамі арганізаваў раздачу сялянам памешчыцкай зямлі, узяў на ўчот усю маёмасць, лес. Многім жыхарам вёскі выданы дровы.

Дружна і энергічна прыступіў да работы Сялянскі камітэт вёскі Малышы Медзведзянскай воласці. Старшыня камітэта Павел Адамовіч Казель з 18 верасня раздаў сялянам-батракам і беднякам больш 15 панскіх кароў; надзяляюцца сяляне зямлёй, сельска-гаспадарчым інвентаром. Гэта толькі пачатак. Сялянскім камітэтам прадстаіць яшчэ вялікая і адказная работа. Камітэты, якія яшчэ да гэтага часу не прыступілі да раздачы сялянам панскай зямлі, павінны зараз-жа гэта рабіць. І не толькі зямлю, але раздаваць усю панскую маёмасць: коней, кароў, авечак сельска-гаспадарчы інвентар.

Трэба павысіць пільнасць і сачыць за тым, каб у сялянскі камітэт не пралезлі варожыя працоўнаму народу элементы.

Асноўнай і першачарговай задачай Сялянскіх камітэтаў з'яўляецца бясперабойная раздача сялянам панскай зямлі і маёмасці, устанаўленне нармальнага жыцця ў вёсцы. Трэба наладзіць своечасовую дастаўку на гарадскія рынкі, для забеспячэння гарадскога насельніцтва, сельска-гаспадарчымі прадуктамі, як хлеб, мяса, масла, малако і іншыя харчавыя прадукты.

Атрымаўшы вялікую падтрымку народаў Совецкага Саюза і яго доблеснай, геральнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, якая ачысціла землі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад польскіх паноў і стварыла ўмовы, забяспечваючыя працоўным сялянам магчымасьць будаваць новае жыццё—жыццё без паноў і памешчыкаў.

Таварышы сяляне! Актыўна ўключайцеся ў будаўніцтва новага жыцця сваімі ўласнымі рукамі. Будуйце, па прыкладу народаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, радаснае, культурнае жыццё.

Народы Соцыялістычнай радзімы заўсёды вас падтрымаюць і будуць аказваць сістэматычную дапамогу ў ажыцяўленні вашай заветнай мары—пабудаваць сваё жыццё без паноў і памешчыкаў.

Тэлеграма Міністра Замежных Спраў Эстоніі Сальтэра Старшыні Соўнаркома і Наркому Замежных Спраў СССР тав. В. М. Молатаву

Старшыне Соўнаркома
і Наркому Замежных
Спраў Молатаву

Масква.

ТАЛІН. Звярнуўшыся на радзіму, прашу Вас, гаспадзін Старшыня, прыняць асабіста і перадаць Правадыру народаў СССР Сталіну, а таксама Наркому Мікаяну шчырую падзяку Эстонскага Ўрада за мудрае кіраўніцтва палітычнымі і гаспадарчымі перагаворамі ў Маскве і за шчаслівае прывядзенне да новых дружаскіх пагадненняў паміж нашымі дзяржавамі для далейшага развіцця іх добрасуседскага і мірнага супрацоўніцтва. Адначасова прашу прыняць шчырую падзяку за аказаную мне і маім суправаджаючым гасцінасьць.

Сельтэр,
Мін. Зам. спраў Эстоніі.

Тэлеграма Старшыні Соўнаркома і Наркоміндзела СССР таварыша В. М. Молатава міністру замежных спраў Эстоніі г. К. Сельтэру

Міністру замежных спраў
Эстоніі, Сельтэру.

Талін.

Шчыра дзякую Вам, гаспадзін Міністр, за Ваша цёплае прывітанне і выражаныя Вамі пачуцці па выпадку адбыўшагася паміж Эстонскай Рэспублікай і Совецкім Саюзам дружаскага пагаднення і нашай сумеснай работы па падрыхтоўцы гэтага пагаднення на карысць далейшага супрацоўніцтва і мірнага развіцця народаў Эстоніі і Совецкага Саюза. Дазвольце выразіць упэўненасць у тым, што наша новае пагадненне створыць спрыяючыя магчымасці дла пад'ёма і росквіту жыцця народаў Эстоніі і Совецкага Саюза.

Молатаў
Старшыня Соўнаркома
і Наркоміндзел СССР.

—:::—

Рашэнне латвійскага ўрада

РЫГА, 2 кастрычніка (ТАСС)- Як паведамляе латвійскае тэлеграфнае агенцтва, рада міністраў Латвійскай Рэспублікі, заслухаўшы даклад міністра замежных спраў Мунтэрса аб пакце паміж СССР і Эстоніяй і германа-совецкім дагаворы, прыйшла да заключэння, што гэтыя дагаворы ўносяць столь важныя змены ў палітычнай сітуацыі ва Усходняй Еўропе, што і Латвія павінна таксама прыступіць да перагляду сваіх замежных адносін і ў першую чаргу з СССР. Урад паручыў міністру замежных спраў Мунтэрсу неадкладна адправіцца ў Маскву, каб увайсці ў прамы кантакт з Урадам СССР. Мунтэрс адпраўляецца ў Маскву 2 кастрычніка.

—:::—

Паездка Мунтэрса ў Маскву

РЫГА, 2 кастрычніка. (ТАСС) Сёння у 12 гадз. дня па мясцоваму часу вылецелі ў Маскву міністр замежных спраў Латвіі п. Мунтэрс і дырэктар дэпартамента дагавораў міністэрства замежных спраў Латвіі Кампе.

Прыбыцце ў Маскву міністра замежных спраў Латвіі п. Мунтэрса

2 кастрычніка г. г. у Маскву прыбыў міністр замежных спраў Латвіі п. Мунтэрс у суправаджэнні п. А. Кампе. Адначасова з міністрам прыбыў паўпрэд СССР у Латвіі тав. І. С. Зотоў і торгпрэд СССР у Латвіі тав. В. Я. Тэрэнцьеў.

На цэнтральным аэрапорце п. Мунтэрса сустрэлі: наместнік Народнага Камісара замежных спраў тав. С. А. Лазоўскі, нам. старшыні Моссовета тав. М. А. Ясноў, загадчык прагакольнага аддзела Народнага Камісарыята Замежных Спраў тав. В. Н. Баркоў, загадчык аддзела Балтыйскіх краін НКЗС тав А. П. Васюкоў, камендант г. Масквы палкоўнік В. А. Рэвякін, увесь састаў латвійскай місіі ў Маскве на чале з чрэзвычайным пасланнікам і паўнамоцным міністрам п. Ф. Коцыньш, а таксама чрэзвычайны пасланнік і паўнамоцны міністр Эстоніі п. Рэй і паверанны ў справах Літвы ў СССР п. Багдонас.

Цэнтральны аэрапорт быў упрыгожан совецкімі і латвійскімі флагамі.

Камюніке германскага вярхоўнага камандавання.

БЕРЛІН, 2 кастрычніка. (ТАСС) Вярхоўнае камандаванне германскай арміі апублікавала наступнае камюніке:

„Учора раніцай германскія часьці ўступілі ў Варшаву. Учора-ж было занята прадмесце Варшавы—Прага.

Апошні пункт польскага супраціўлення — умацованы паўвостраў Хэль — учора паддаўся безагаворачна яшчэ да таго, як была праведзена падрыхтоўка для супольнага наступлення германскіх войскаў і ваенна-марскога флота. Сёння раніцай гарнізон Хэля, складзены з 52 афіцэраў, у ліку якіх камандуючы польскім ваенна-марскім флотам контр-адмірал фон-Інруг і 4000 салдат, здаўся германскім войскам. На Захадзе мела месца толькі артылерыйская перастрэлка і разведвальная дзейнасць. Усходней Падэрборна быў збіты англійскі разведвальны самалёт“.

—:::—

Прэдстаяшчая паездка ў Маскву літоўскага міністра замежных спраў п. Урбшыса

КАУНАС, 2 кастрычніка (ТАСС). Літоўскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што „па запрашэнню Старшыні Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў СССР Молатава, міністр замежных спраў Літвы Урбшыс 3 кастрычніка выязджае ў Маскву. Мэта паездкі — абгаварэнне пытанняў цікавячых Літву і СССР.

—:::—

Прыём міністра замежных спраў Латвіі п. Мунтэрса тав. В. М. Молатавым

2 кастрычніка г. г. ўвечары адбылася гутарка тав. Молатава з міністрам замежных спраў Латвіі п. Мунтэрс.

У гутарцы прынялі ўдзел т. т. Сталін, Пацёмкін і паўпрэд СССР у Латвіі т. Зотоў, а таксама латвійскі пасланнік у Маскве п. Коцыньш.

Гутарка прадаўжалася дзве гадзіны.

—:::—

Ад'езд Чыано з Берліна

БЕРЛІН. 2 кастрычніка (ТАСС.) Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што сёння ў поўдзень Чыано выехаў з Берліна ў Рым.



Дарагія землякі!

З пісьма тав. Якуба Коласа

Па радыё я чуў і чытаў у газеце, што адзін з маіх аднафамільцаў і землякоў, Ігнат Міцкевіч, прасіў перадаць мне, каб я прыехаў у сваё раднoе сяло Мікалаўшчыну для сустрэчы з сваімі землякамі і родзічамі, каб пабачыцца з імі, ды пагутарыць, як кажуць, з вока на вока, шчыра і проста.

Даўно мяне цягне свой родны куток, дзе я гадаваўся, вучыўся, дзе правёў свае маладыя леты, куток, якога я не бачыў ужо з 1915 г. З гэтага часу я бываў у Мікалаўшчыне толькі ў мыслях ды ў сне. Сніліся мне і Канцывалокі, і Міхалаў крыж, і Дуброўкі, і Лядзіны, і Бервянец, і Раймусава шырокая, і Высокі бераг, і сотні іншых урочышч, якіх цяжка пералічыць і назвы якіх быць можа забыліся або перайначыліся.

А за гэты час шмат вады выцекла, шмат хто з маіх родных, сваякоў і знаёмых навекі супакоіўся пад убогім крыжам у жоўтым пяску Церабяжоў, не пабачыўшы светлай долі, не разагнуўшы прыгнутай горам спіны, не дачакаўшыся ясных дзён вызвалення, дзён, якія прышлі цяпер к вам і з якімі ад чыстага сэрца я віншую вас, дарагія браты і сёстры.

Граніца, разлучаўшая нас дзесяткі гадоў, сцёрта, і мы пойдзем далей разам рука ў руку. Вы будзеце сумесна з намі будаваць сваё жыццё ўласнымі рукамі, як поўнапраўныя гаспадары сваёй зямлі, без паноў і панскіх указчыкаў.

Нічога добрага не пакінулі паны на памяць аб сабе. Яны жылі толькі для сябе, як паўкі высмоктвалі сокі з народа, каб на яго пакутах і здзеках жыць сыта і раскошна. Саджалі на кол, вешалі за рэбры, палілі жывымі ў агні, з жывых здзіралі скуры. Яны хваліліся, што будуць ваяваць з немцамі пад Берлінам, а на другі дзень вайны ганебна, на смех усяму свету, пачалі разбягацца, як мышы, ва ўсе бакі, дзе толькі трапляла шчыліна, пакінуўшы і войска сваё, свой народ. Жывучы ў 20 стагоддзі, яны пазіралі на свет, як сярэдневяковыя цемрашалы. Жыццё паказала, што на бізунах, ксяндзах і папах многа не наедзеш. Нетрэба толькі мяшаць паноў з польскім працоўным народам. Польскаму народу, здольнаму і таленавітаму, даўшаму свету вялікіх паэтаў, мастакоў і вучоных, па-братэрску мы падаем руку. На нашых сцягах напісаны вялікія словы: „Дружба народаў“.

Паны і панскія паслугачы шмат распускалі хлусні і паклёпу пра нас і, пэўна, знайшлі сям-там прасталушных людзей, якія ім паверылі. Вось чаму ўсюды там у вас з такой цікавасцю пытаюцца ў байцоў Чырвонай Арміі, як жывем мы тут. Пэўна-ж і вы хочаце пачуць пра гэта і ад мяне.

Расказваць падрабязна ў гэтым пісьме я не буду. Вы зможаце самі пабываць у Мінску, у Кіеве, у Маскве і ў розных мясцінах. Вы сваімі вачамі пабачыце, як жыве народ у Совецкім Саюзе, якія правы заваяваў ён пад сцягам нашай партыі, пад сцягам Леніна — Сталіна. Усюды кіпіць жыццё радаснае, творчае. Усім нам, мужчынам і жанчынам, шырока расчынены дарогі ў жыццё. Усе нашы народы адзінаццаці рэспублік, жывуць дружна, маюць свае школы, тэхнікумы, універсітэты, тэатры, клубы, дамы адпачынку, курорты, дзіцячыя яслі, сады і палацы. На дапамогу працоўнаму чалавеку, хлебаробу-калгасніку прышлі сотні тысяч рознастайных машын. А паны вам казалі, што нічога ў нас няма, што нашы машыны на гліняных калёсах. Цяпер яны самі адчулі на сваёй скуры гэтыя „гліняныя“ калёсы совецкіх танкаў і гармат. Ашуканствам можна свет прайсці, але назад не вернешся.

Да скорага пабачэння, дарагія браты. Ачышчайце свае землі ад панскага павуціння, ад панскай агентуры.

Жадаю вам поспехаў.

Ваш Якуб Колас.

Загад выканан

Цемра. Вакол цішыня. Зацямнёныя фары машыны бледным адсветам кідаюць на расістую траву чуць прыкметны свет.

У такіх умовах вельмі цяжка ўстанавіць распалажэнне праціўніка, выведаць яго агнявыя точкі. Не лёгка весці і агонь з машыны.

Аднак, камандзір—комуніст тав. Дземеншчонак, атрымаўшы адказную і ганаровую задачу—перайсці дзяржаўную граніцу і ўстанавіць распалажэнне агнявых точак праціўніка—цвёрда рашыў па-большэвіцку выканаць задачу, апраўдаць аказанае давер'е.

...Без шума рухаецца ўперад баявая машына. Камандзір зорка ўглядаецца ў начную цемру.

Граніца пяройдзена з поспехам. Нічога не відаць і не чуваць, ўсё, як быццам, вымерла.

Але прайшоўшы метраў 50, тав. Дземеншчонак заўважыў якоесці чорнае пляма, не выклікаўшае, здавалась, ніякай падазронасці. Ён загадаў механіку весці машыну на заўважанае пляма.

Калі гэта супроцьтанкавая гармата, дзе-ж рашчот? Чаму ніхто не пачынае абстрэл? Не інакш, як каварны вораг прыгатаваў якую-небудзь лавушку. Адно за другім у ён калі пытанні, і як быстра прыходзілі, так быстра і знікалі яны.

Тав. Дземеншчонак было ўжо падумаў, што гэта так, абман зрэнія, як нечакана заўважыў бягучых да чорнага пляма двух чалавек.

Машына ішла поўным ходам. І чорнае пляма стала ператварацца ў супроцьтанкавую гармату.

Значыць ясна: у гарматы няма рашчота. І толькі зараз к ей бягуць два польскія салдаты. Вось яны зусім блізка.

Гулкі стрэл нарушыў ранішнюю цішыню. Воблака чорнага дыму закрыла супроцьтанкавую гармату. Пачуліся праклёны і крыкі сражоных адным стрэлам ворагаў.

З вокан польскай стражніцы затрашчаў польскі кулямёт. Тав. Дземеншчонак пагледзеў яшчэ раз туды, дзе была гармата і нічога не ўбачыў, усё зраўнялася з зямлёй.

От, гады, зараз я зразумеў ваш манеўр, — сказаў камандзір і адразу-ж загадаў весці машыну прама на стражніцу, адкуль увесь час страчыў кулямёт, раздаваліся вінтовачныя залпы. Бясстрашны экіпаж рухаўся прама на праціўніка. Польскія салдаты, бачачы, што іх супраціўленне не мае поспеха, кінуліся уцякаць у лес.

Жалкае супраціўленне стражніцы зломлена. Пятнаццаць салдат забіты, астатнія гераічным экіпажам узяты ў палон і разам з захопленымі трафеямі накіраваны ў бліжэйшы пагранатрад. Баявое заданне выканана.

Атрымаўшы новае заданне, тав. Деменшчонак паімчаўся на грознай машыне.

Яго танк прыбыў у мястэчка Н. Радасна. З захапленнем сустрэлі працоўныя мястэчка гераічны экіпаж. З чырвонымі транспарантамі, на якіх было напісана: „Няхай жыве магутная Чырвоная Армія“, „Няхай жыве комуністычная партыя большэвікоў і яе правадыр таварыш Сталін“, з воклічамі: „Дзякуй, таварышы, за наша вызваленне“ — яны з усіх бакоў ішлі да экіпажа. Дзяўчаты падносілі букеты жывых кветак, старыкі частавалі фруктамі.

З прыходам у мястэчка першага совецкага танка жыццё працоўных закіпела па новаму. Зараз яны самі будуць будаваць для сябе раднаснае і шчаслівае жыццё без эксплаататараў-памешчыкаў і паноў.

Радасці народа не было канца. Чырвоная армія са сваім прыходам прынесла ім не толькі вызваленне ад эксплаатацыі, але і чалавечае жыццё.

Супроць часцей чырвоных войск вядуць барацьбу толькі эксплаататары і іх стаўленнікі—паліцэйскія, жандармы і афіцэры. Але супроць добра ўзброенай, аснашчонай першакласнай тэхнікай Чырвонай Арміі яны бяссільны.

Г. Ясюцін.



На ўсіх прадпрыемствах г. Вільно адбыліся выбары рабочых троек. **На здымку:** (злева направа) т. т. Добруга, В. Лукашэвіч, П. Заенчкоўскі — абраныя ў склад тройкі рабочымі лесапільнага завода Эпштэйна фото Сапіра

Першая нарада старшынь Сялянскіх Камітэтаў

30 верасня ў Новагрудскім кінотэатры адбылася нарада старшынь Сялянскіх Камітэтаў Новагрудскага павету.

З дакладамі аб далейшых задачах сялянскіх камітэтаў выступіў прадстаўнік Часовага Ўпраўлення Кузняцоў.

Падводзячы вынікі першых дзён работы Сялянскіх Камітэтаў, тав. Кузняцоў паставіў перад удзельнікамі нарады рад канкрэтных задач па раздзелу панскай зямлі, цягла і няжывога інвентара, завяршэння сяўбы і аб рабоце школ.

Старшыні Сялянскіх Камітэтаў ў сваіх выступленнях дзяліліся вопытам сваёй работы, расказвалі аб тым, як яны дзеляць панскую зямлю, як Сялянскія Камітэты разам з Рабочай Гвардыяй вядуць барацьбу з рэшткамі афіцэрства, паноў, якія ўзброіўшыся схаваліся ў лесе.

Выступаўшыя таварышы расказвалі аб вялікай радасці сялян, аб іх удзячнасці Чырвонай Арміі, совецкаму народу, вялікаму Сталіну — за вызваленне іх ад панскага прыгнёту.

Тут, на нарадзе былі выкрыты 2 правакатары, якія прабраліся ў Сялянскія Камітэты.

З вялікім уздымам нарада прыняла прывітальнае пісьмо таварышу Сталіну. (БелТА)

—:::—

Чырвонаармеец Сідараў затрымаў двух афіцэраў

Глыбокае, цёмнай ноччу чырвонаармеец-шофер таварыш Сідараў, атрымаўшы баявую задачу ад камандзіра, павёў машыну ў прызначанае месца.

На адным з перагонаў, у некалькіх кроках ад дарогі, таварыш Сідараў заўважыў двух узброеных чалавек перабегшых яму дарогу.

— Ці не вораг гэта?—падумаў сам сабе Сідараў.

— Так, гэта ён, вораг — канчаткова рашыў ён.

Сідараў моцна націснуў на педалы машыны і хутка выскачыў з яе.

—- Стой! Рукі ўверх, — скамандаваў чырвонаармеец.

Збянтэжаныя са страху польскія ваякі, трымаўшыя ў руках бомбы і пісталеты, ціханька паклалі іх на зямлю. Гэта былі два польскія афіцэры.

Падаспеўшая на дапамогу каманда байцоў, узяла афіцэраў у палон.

М Умывакін
Малодшы палітрук.

Баявое мастацтва

Вялікай сталінскай праўдаю дыхаюць магутныя словы канстытуцыі СССР аб праве на труд, на адпачынак і на асвету. Пад праменнямі Сталінскай Канстытуцыі растуць і квітнеюць многанацыянальныя рэспублікі советаў.

У мінулым забітыя, прыгнечаныя акраінныя калоніі памешчыцкай Расіі выраслі ў моцныя соцыялістычныя рэспублікі. Такія — Казахстан, Туркестан, Таджыкістан. Такава вольная цяпер Кіргізія. Такава ордэнаносная Беларусь — багацейшая рэспубліка — у мінулым краіна пяскоў, балот і галечы. Большэвікі вялікія прэабразавацелі. У пустынях Кара-Кума, дзе зрэдку хадзілі вярблюды — цяпер гудзяць паравозы. Волга панесла свае воды ў Маскву. Белае мора звязана шырокім каналам з Балтыйскімі водамі. Квітнее магутная краіна. Няма ў нас беспрацоўных. Няма галечы, Усё гэта нашло яркае адлюстраванне ў совецкім мастацтве.

Вялікая Сталінская Канстытуцыя ў заканадаўчым парадку замацавала права працоўным на адпачынак права на культурнае жыццё. Мы любім адпачываць весела і карысна. Совецкае мастацтва СССР пастаўлена на службу працоўным.

Нашы канцэрты ў гарадах і вёсках Заходняй Беларусі ярка дэманстравалі перад народам поспехі. Яны ператвараліся ў свята для асвабанёнага народа. Упершыню беларусы убачылі свае народныя танцы. Упершыню працоўныя Заходняй Беларусі даведаліся, што ёсць такая краіна, дзе ўсе нацыянальнасці роўны і культура іх расце без усякай абмежаванасці.

Вось ужо 15 дзён Дзяржаўны ансамбль народнага танца Саюза ССР працуе ў вёсках, мястэчках і гарадах вызваленай краіны. Адразу ўслед за Чырвонай Арміяй, першымі веснікамі совецкага мастацтва, першымі прадстаўнікамі грамадзянскага насельніцтва СССР прыехалі мы сюды. 32 канцэрты хвалюючых нас да глыбіны сэрца далі, совецкія артысты. Ніякія цяжкасці не стрымалі напора жыццерадаснай совецкай моладзі. Сотні кілометраў на грузавіках, кароткі сон на саломе не змаглі падламіць энергіі маладых патрыётаў. Па 3—4 канцэрты ў дзень, амаль без перапынкаў паказваў ансамбль у вёсках і мястэчках. І лепшай нагарадай для нас былі шчаслівыя ўсмешкі вызваленых братоў, слёзы радасці прастарэлых мацярэй, якія бачылі ў нас будучае сваіх дзяцей.

Мястэчка Глыбокае. Учора тут яшчэ царавалі паны. Учора тут яшчэ збівалі за размову на беларускай мове. Учора яшчэ нельга было марыць аб тым, каб прайсці на стадыён, дзе весяліліся панічы. Сённі да адказу перапоўнен трэугольнік стадыёна. Рабочыя, сяляне; беларусы, яўрэі, палякі — усе працоўныя горда паднялі галавы. Яны гаспадары. Для іх ідзе канцэрт. За 20—25 км. з'ехаліся яны сюды. Смела і упэўнена сумесна з артыстамі яны ўпершыню запелі вялікі гімн свабоды — Інтэрнацыянал. Пад гром апладысментаў і бурные воклічы „Ура!“, праходзілі кралачныя танцы народаў СССР. Вось яна Сталінская Канстытуцыя ў дзеянні. Рускія, яўрэі, армяне, грузіны, палякі, немцы, фіны — патрыёты-артысты СССР, дружным спаяным калектывам паказалі сваю творчасць вызваленым братам. Дыханнем магутнага Сталіна павеяла на стадыёне. Натхнёныя выдатным канцэртам, працоўныя вышэй паднімаюць галовы, шырэй распраўляюць плечы. Яны гатовы к барацьбе і перамозе.

Бедна і бескультурна жылі тут. Нідзе, акрамя Вільно мы не маглі знайсці памяшчэнне для канцэртаў. А у СССР амаль ў кожнай вёсцы, у кожным калгасе, не гаворачы ўжо аб гарадах, ёсць клубы і тэатры. Не было ў працоўных Заходняй Беларусі ніякіх правоў, ні на адпачынак, ні на асвету, ні на гарантаваную работу. Ён не быў упэўнен у заўтрашнім дні. Не да радасці і вясёлля было яму. Толькі зараз, калі магутная, несакрушымая Чырвоная Армія па волі народаў СССР і па просьбе працоўных Заходняй Беларусі прынесла свабоду, і працоўныя ўпэўнена глядзяць у будучыню, ведаючы, што заўтра будзе яшчэ лепш, што яны сумесна са сваімі братамі — народамі СССР, з іх дапамогаю пабудуюць шчаслівае і радаснае жыццё.

Сазнанне, што мы робім вялікую палітычную справу, запальвае ў нас творчы энтузіязм. Мы адчуваем і разумеем, што сваёй работай дапамагаем сваім братам яшчэ глыбей асвоіць нязмерную скарбніцу Сталінскай Канстытуцыі. Артысты ансамбля ў сваёй большасці моладзь. Яны ўсім сэрцам рады за працоўных Заходняй Беларусі. За дні работы на вызваленай зямлі 19 артыстаў падалі заявы аб прыёме ў кандыдаты партыі, 6 артыстаў — у комсамол. Людзі совецкай зямлі любяць сваю вялікую партыю Леніна-Сталіна. У дні вялікіх іспытанняў, у дні велізарнай радасці першыя свае мыслі яны напраўляюць да любімага Сталіна.

Совецкае мастацтва—баявое мастацтва. Сваімі карнямі яно ўходзіць у народ, у яго жыццерадаснасць, творчасць. Артысты Краіны Советаў — мужныя байцы на любым участку работы і барацьбы. Крыніцай іх сілы упэўненасці з'яўляецца Вялікая Сталінская Канстытуцыя.

М. Кручкін
Камісар ансамбля.

Росквіт народнай асветы ў БССР

Свабодны ад пут эксплаатацыі беларускі народ, кіруемы мудрай партыяй Леніна — Сталіна, вось ужо 20 з лішнім год будуе сваё шчаслівае і радаснае жыццё, будуе сваю культуру. Толькі ўзяўшы ўладу ў свае рукі, беларускі народ атрымаў права прававаць на сябе, развіваць сваю нацыянальную па форме і соцыялістычную па зместу культуру.

Жудаснае мінулае беларускага народа кануда ў вечнасць. За годы соцыялістычнай рэволюцыі народ квітнеючай ордэнаноснай Совецкай Беларусі далёка шагнуў уперад да вяршынь навукі, культуры і мастацтва. У галіне асветы беларускі народ карыстаецца ўсім тым, што запісана ў праграме комуністычнай партыі: бясплатнай агульнай і палітычнай асветай для ўсіх дзяцей абодвух полаў, шырокай сеткай дашкольных устаноў — яслямі, дзіцячымі садамі, ачагамі, адзінай школай для ўсіх з выкладаннем на роднай мове, школай свецкай, г. зн. свабоднай ад якога-б там ні было рэлігійнага ўплыву; усебаковай дапамогай самаадукацыі і самаразвіццю рабочых і сялян шляхам стварэння пазашкольных устаноў—бібліятэк, школ для дарослых, народных дамоў, курсаў, лекцый, кінематографаў, студый і т. д.; прадастаўленнем працоўным усіх скарбніц мастацтва, якія знаходзіліся раней у выключным распараджэнні эксплаататараў.

Велізарныя гістарычныя перамогі беларускага народа замацаваны ў Канстытуцыі БССР.

„Грамадзяне БССР маюць права на асвету.

Гэтае права забяспечваецца ўсеагульна-абавязковай пачатковай асветай, бясплатнасцю асветы, уключаючы вышэйшую асвету, сістэмай дзяржаўных стыпендый пераважнай большасці навучаючыхся ў вышэйшай школе, навучаннем у школах на роднай мове, арганізацыяй на заводах, ў соўгасах, машына-трактарных станцыях і калгасах бясплатнага вытворчага, тэхнічнага і агранамічнага абучэння працоўных“. (Канстытуцыя БССР. артыкул 96).

Гэта права працоўных нерушыма. Усе совецкія дзеці, уся моладзь — вучацца.

Квітнеючая Беларуская, ордэнаносная рэспубліка мае зараз 7089 школ, з іх з сямігадовым абучаннем — 1684 і з дзесяцігадовым — 693. У гэтых школах абучаецца звыш мільёна дзяцей. Гэта—дзеці рабочых, калгаснікаў і служачых.

За дзве сталінскіх пяцігодкі наша рэспубліка пакрылася густой сеткай пачатковых, сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў.

У нашай краіне ажыццёулена абавязковае пачатковае абучэнне. У гарадах закончан ахват дзяцей сямігадовым абучэннем. Так-сама ахвачана сямігодкамі 96 проц. дзяцей сяла.

Паказальны рост навучаючыхся ў 8—10 класах за апошнія годы. Калі ў 1932 годзе ў 8—10 класах вучылася ў яго толькі 709 чалавек, то ў 1938—39 годзе — 52.370 чалавек, што складае рост больш чым у 73 разы. У 1939—40 вучэбным годзе ў 5—7 класах абучаецца 371.210 чалавек, а ў 8—10 класах — 85.960 чалавек. Гэта поўнасцю забяспечвае выкананне задачы, пастаўленай XVIII партз'ездам — ажыццяўленне ў трэцяй пяцігодцы ўсеагульнага 10-гадовага абучэння ў горадзе і завяршэнне сярэдняга сямігадовага абучэння ў вёсны з разшырэннем дзесяцігадовага абучэння.

Кваліфіцыраваныя кадры совецкай інтелігэнцыі выхоўваюцца ў 23 вышэйшых навучальных установах і ў рознага роду тэхнікумах і вучылішчах, якіх налічваецца 101. У яго ў вышэйшай школе, тэхнікумах і рабфаках БССР вучыцца 54.000 студэнтаў. У 1938 годзе вышэйшыя навучальныя ўстановы выпусцілі 3038 спэцыялістаў, з іх — 375 інжынераў, 1796 педагогаў 464 урачы, 280 эканамістаў-планавікоў і інш. Акрамя таго, штогод выпускаецца з нашых школ вялікая колькасць агрономаў, работнікаў мастацтва і іншых спецыялістаў. Сярод студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў вялікая колькасць жанчын. Сярод навучаючыхся тэхнікумаў і вучылішчаў 44 проц. жанчын.

Велізарным заваяваннем працоўных з'яўляецца права грамадзян СССР на абучэнне ў школах на роднай мове. Беларускі народ у мінулым быў пазбаўлен магчымасці мець школы на сваёй роднай мове. У даны момант пераважная большасць школ — беларускія. Сярод вучняў пачатковых і сярэдніх школ — 86.6 проц. беларусы. Сярод настаўнікаў, армія якіх у даны момант вырасла да 40.164 чалавек 84,5 проц. беларусоў. 80 проц. іх скончылі совецкія навучальныя ўстановы.

Ва ўсіх совецкіх школах абучэнне праводзіцца зусім бясплатна. Больш таго, пераважная большасць студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, тэхнікумаў, рабфакаў і вучылішчаў атрымлівае дзяржаўную стыпендыю і інтэрнаты. Каб уявіць сабе, якія велізарныя сродкі адпускае дзяржава на падрыхтоўку кадраў для народнай гаспадаркі краіны, дастаткова ўказаць, што на падрыхтоўку аднаго інжынера ў вышэйшай тэхнічнай навучальнай установе дзяржава расходуе ў сярэднім 20 900 рублёў, у тым ліку 10.400 рублёў студэнт атрымлівае ў выглядзе стыпендыі.

Рост соцыялістычнай гаспадаркі і разгорнутае культурнае будаўніцтва забяспечылі ў нашай рэспубліцы велізарны ўздым навукі. Калі ў дарэволюцыйнай Беларусі не было ні адной навукова-даследчай установы, то ў даны момант у рэспубліцы іх 39. Сярод іх Акадэмія навук БССР, інстытуты прамысловасці, сельскай гаспадаркі, хіміі, біялогіі, гісторыі, мовы, аховы працы і т. д. і т. п. У гэтых навуковых установах працуюць 1213 акадэмікаў, прафесараў, дацэнтаў, старшых навуковых работнікаў і інш., сярод якіх 270 жанчын.

Совецкія гарады і вёскі маюць вялікую сетку агульнаадукацыйных культурна-асветных устаноў. Асвета ў совецкай дзяржаве даступна кожнаму: і дзецям, і даросламу насельніцтву. Вялікая сетка школ па ліквідацыі непісьменнасці забяспечыла ў Совецкай Беларусі амаль усеагульную граматнасць дарослага насельніцтва як мужчын, так і жанчын. З кожным годам становіцца ўсё менш малапісьменных.

Рабочым, калгаснікам і служачым прадастаўлены ўсе магчымасці павышаць сваю асвету і сваю кваліфікацыю без адрыву ад вытворчасці — у вячэрніх і завочных навучальных установах, шляхам экстэрната, рознага роду курсаў і інш. У завочных вышэйшых навучальных установах і тэхнікумах толькі сістэмы Наркамаасветы БССР абучаецца 18 тысяч чалавек.

Гэтыя магчымасці гарантараваны вялікай сеткай навучальных устаноў, буйнымі дзяржаўнымі асігнаваннямі, сістэмай дадатковых водпускаў рабочым і служачым.

У старай Беларусі амаль зусім

(Працяг на 3 стр.)

На сходзе пісьменнікаў і журналістаў

Учора аддзел культуры і асветы Часовага Упраўлення г. Вільно правеў сход пісьменнікаў і журналістаў горада. На сходзе прысутнічала каля 100 чалавек беларускіх, польскіх, яўрэйскіх і літоўскіх пісьменнікаў, паэтаў і журналістаў.

Загадчык аддзела культуры і асветы тав. Клімаў расказаў сабраўшымся аб сучасным міжнародным становішчы і паставіў рад практычных задач перад пісьменнікамі і журналістамі. Тав. Клімаў падрабязна застанавіўся на развіцці культуры і мастацтва ў Совецкай краіне і Совецкай Соцыялістычнай Беларусі.

Затым выступалі пісьменнікі, якія выказвалі сваю гатоўнасць працаваць на карысць народа. З увагай было выслухана выступленне літоўскага пісьменніка тав. Шулья.

— Літоўцы, як і ўсе працоўныя нацыянальных меншасцей, насяляўшых панскую Польшчу, — гаворыць тав. Шулья, — цярпелі 20 год нацыянальны і соцыяльны гнёт. Нам нельга было вучыцца, для нас былі зачынены дзверы і ў навуку і мастацтва, нельга было, нават работы знайсці.

Мы ведалі, што нас прыгнятаюць польскія паны, вярхушка шляхты. Вялікая радасць і шчасце для ўсіх нас жыць і тварыць у адзінай дружнай брацкай сям'е народаў. Мы гатовы аддаць усе свае сілы на ўмацаванне адзінства і дружбы народаў.

— Я нацыянальнасці паляк, — гаворыць у сваім выступленні пісьменнік т. Путрамент. — Але для нас, працоўнай польскай інтэлігенцыі, 20 год панавання польскіх паноў былі гадамі пазора і сорама.

— Нам было балюча глядзець на пакуты працоўных Заходняй Беларусі, на здзекі польскіх паноў над працоўным. Мы адчувалі лютую нянавісць да буржуазіі і памешчыкаў, але мы былі бяссільны.

— І вось зараз назаўсёды знікла гэта няроўнасць, эксплаатацыя і векавечны гнёт польскіх паноў. Стаўшы свабоднымі, мы будзем тварыць, радасна жыць у адзінай сям'е народаў вялікага Совецкага Саюза.

На сходзе былі намечаны практычныя мерапрыемствы па арганізацыі работы сярод пісьменнікаў і журналістаў г. Вільно.

* * *

2 кастрычніка адбыўся сход мастакоў г. Вільно, скліканы аддзелам культуры і асветы Часовага Ўпраўлення. Прысутнічала на сходзе 55 чалавек мастакоў.

Сход рашыў прыступіць да разгортвання работы мастакоў па ўпрыгожванню горада, школ, бібліятэк і тэатраў.



Гэтымі днямі пачала работу Віленская Беларуская Гімназія.
На здымку: Дырэктар гімназіі (сядзіць першы з права) тов. Кавалевіч прымае заявы ад жадаючых паступіць на настаўніцкія курсы фото Сапір

Бурна закіпела жыццё ў беларускай гімназіі

Беларускія сярэднія школы (гімназіі) ў Вільно з самага пачатку свайго існавання перажывалі цяжкі лёс.

Спачатку, калі гімназія была прыватнай, вучні галадалі, а настаўнікі не атрымоўвалі цэлымі месяцамі пэнсію, бо польскія ўлады, якім гімназія заўсёды калола вочы, не хацелі даваць беларускай школе ніякай дапамогі.

У 1932 годзе польскія ўлады пачалі крыху плаціць настаўнікам пэнсію, але адначасова зрабілі з гімназіі філію польскай гімназіі, дырэктар якой фактычна быў і дырэктарам беларускай філіі.

Але гэтага было яшчэ мала — новая утвараная філія таксама была страшна для польскіх уладаў. Яны паставілі мэту — дабіць канчаткова беларускую сярэднюю школу. І вось без ніякай прычыны ў 1936 годзе польскія школьныя ўлады выкінулі беларускую філію з даўняшага яе памяшкання і пераводзяць у смердзячы цёмны куток. Адначасова пачалася ліквідацыя старэйшых класаў гімназіі і амаль поўная паланізацыя — апаляччванне школы.

У гэтым годзе школьныя ўлады мелі намер ліквідаваць выкладанне ўсіх беларускіх прадметаў і нават быў праект зусім закрыць філію, але дзякуючы прыходу слаўнай Чырвонай Арміі гэтага не паспелі зрабіць польскія паны.

Зараз, вызваліўшыся ад панскага іга, беларуская гімназія ў Вільно мае поўную магчымасць развівацца і пашырацца. Адкрываюцца два вышэйшыя класы (ліцэальныя), якіх да гэтага не было, апрача гэтага, адкрываюцца пры гімназіі настаўніцкія курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў пачатковых школ. У гімназію, на курсы прыязджаюць беларусы з далёкіх вёсак, якія жадаюць вучыцца ў сваёй роднай школе. Бурна закіпела новае жыццё ў беларускай гімназіі ў Вільно. Усе працоўныя гімназіі і моладзь шчыра дзякуюць слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Совецкаму Ураду, за тое, што не забыліся пра нас і вызвалілі ад панскага здзеку.

В. П. Кавалевіч.

—:::—

У вызваленым горадзе Пінску

З вялікім уздымам прайшоў сход працоўных, якія ўступілі ў атрад рабочай гвардыі. На сходзе прысутнічала звыш 400 чалавек.

Тав. Дадзюк — начальнік Рабочай гвардыі, член Комуністычнай Партыі Заходняй Беларусі, у сваім выступленні расказаў аб вялікай рабоце, якую правёў атрад за 10 дзён пасля ўступлення ў горад Чырвонай Арміі. Выяўлены дзесяткі ворагаў народа. Ліквідаваны асобныя афіцэрскія групы. Наладжана ахова прадпрыемстваў, пошты, тэлеграфа і іншых устаноў горада. Насельніцтва аказвае актыўную дапамогу рабочай гвардыі па ачыстцы горада і яго ваколіц ад бандытаў

На гэтым сходзе прыводзіліся факты вялікай работы, праведзянай прадстаўнікамі Чырвонай Арміі і Часовым Упраўленнем. У рэзультаце горад, які налічвае 48 тысяч жыхароў, пачынае жыць нармальным жыццём. Усе прадпрыемствы горада: 3 паперныя заводы, запалкавая фабрыка, 2 лесапільныя заводы, працуюць поўным ходам. У школах аднавіліся заняткі. У бальніцы арганізавана бясплатная медыцынская дапамога для малазабяспечаных жыхароў. Адкрыты амаль усе магазіны. Раненыя чырвонаармейцы, якія знаходзяцца ў мясцовай бальніцы, акружаны увагай і клопатамі.

На вуліцах заўсёды людна. На дамах чырвоныя сцягі. Кінотэатры перапоўнены. Фільм «Мы з Кранштадта» дэманструецца 4 разы ў дзень. Усюды чутны словы ўдзячнасці Совецкаму Ураду, Чырвонай Арміі, таварышу Сталіну.

Удзельнікі схода прынялі рашэнні, накіраваныя на далейшае ўмацаванне дысцыпліны ў радах атрада Рабочай гвардыі, павышэнне пільнасці і ўстанаўленне рэволюцыйнага парадку ў горадзе і яго ваколіцах.

(БелТА)

Хто кіраваў Польшчай

Польская дзяржава скончыла сваё існаванне. Польскі ўрад, на чале з прэзідэнтам Польшчы Масьціцкім, і ўсе больш ці менш відныя прадстаўнікі дзяржаўнай улады і ваеннага камандавання кінулі на волю лёсу свой народ і армію і ўцяклі, хто куды патрапіў.

Маланканосны развал Польшчы зусім не выпадковы. Ваеннае паражэнне Польшчы было выклікана ўсёю ўнутранаю і знешняю палітыкай польскіх кіруючых колаў.

Незалежнасць Польшчы з першых дзён яе існавання насіла далёка прызрачны характар. Глыбока пранікшы ў эканоміку Польшчы замежны капітал і з'явіўся фактычным гаспадаром. Доля ўдзелу замежнага капітала ў сродках 1.414 акцыянерных таварыстваў, існаваўшых у Польшчы, складала каля 43 процантаў. У асобных галінах прамысловасці доля ўдзелу замежнага капітала была яшчэ вышэйшай. Напрыклад, у нафтавай—85,6 проц., у горна-металургічнай — 56,8 проц. і г. д.

Пануючае становішча ў польскай народнай гаспадарцы займалі франка-бельгійскі, англійскі і амерыканскі капіталы. Замежны капітал аказваў уплыў не толькі на гаспадарчае развіццё Польшчы, але і на знешнюю і ўнутраную палітыку гэтай краіны. У аснове імперыялістычных імкненняў Польшчы ляжалі не толькі вялікадзяржаўныя тэндэнцыі польскіх буржуазна-памешчыцкіх колаў, але і апетыты замежных капіталістаў.

Прыход да ўлады пілсудчыкаў у 1926 г. быў ажыццяўлён дзякуючы падтрымцы з боку капіталістычных канцэрнаў Францыі і Англіі — Шнейдэр-Крэзо, Вікерс-Армстронг і інш.

Дабраўшыся да дзяржаўнай улады, пілсудчыкі, да таго як маса гравіўшыя прадажнасць і маральнае разлажэнне сваіх папярэднікаў і трэбаваўшыя „санацыі" (аздараўлення), пачалі сваю дзейнасць з умацавання асабістых фінансаў.

Расходы на ўтрыманне кіруючай вярхушкі дзяржаўнага апарата і арміі рэзка ўзраслі. Ніводзін заказ, ніводная пастаўка дзяржаве сыравіны, абсталявання прамысловых вырабаў або ўзбраення не прыходзілі без адпаведнай „уцечкі" дзяржаўных сродкаў у кішэні прычасных да гэтага прадстаўнікоў польскіх кіруючых колаў.

Польскія фабрыканты і пастаўшчыкі снабжалі армію нядобраякаснай прадукцыяй, а ваенную прамысловасць — нізкае якасці сыравінай. Брак у іх пастаўках дасягаў іншы раз 80—90 процантаў.

Прадажнасць і разлажэнне польскіх кіруючых колаў, як адна з прычын развала польскай дзяржавы, фігуруюць у гістарычных лёсах гэтай краіны не ў першыню. Характарызуючы польскую шляхту часоў Кацярыны II, Энгельс у сваім пісьме Марксу 21 красавіка 1863 г. пісаў:

„Павінен сказаць: захапляцца палякамі 1772 года можа толькі буйвал. У большасці еўрапейскіх краін дваранства пала ў тую эпоху з дастойнасцю, часткай нават з некаторым esprit (блескам)... Але ніводнае дваранства не паступала так па дурному, як польская шляхта, усвоіўшая сабе адзін метад — прадавацца..." *).

Але ніколі ў гісторыі Польшчы разлажэнне, корупцыя ў асяродзі яе пануючых класаў не дасягалі такіх велізарных размераў, як за час прабывання пры ўладзе пілсудчыкаў.

Карціна ўсеагульнага разлажэння і прадажнасці польскіх кіруючых колаў будзе далёка няпоўнай, калі абмінуць шпіёнска-правакатарскі бок іх дзейнасці, я унутры краіны, так і на-за ёю. Пілсудчыкі яшчэ задоўга да ўтварэння польскае дзяржавы набылі вопыт у гэтай галіне, дзейнічаючы ў якасці шпіёнскай агентуры рознастайных генеральных штабаў. Імі нна пілсудчыкі залажылі асновы шпіёнска-тэрарыстычна-правакатарскай дзейнасці створанай імі „Польскай ваеннай арганізацыі" (ПОВ).

Як сведчыць былы японскі міністр замежных спраў Хірота ў сваіх успамінах, апублікованых у японскім журнале „Хінодэ", многія пілсудчыкі былі японскімі агентамі, дзейнічаючы супроць Расіі.

Наглядна пераканаўшыся ў даходнасці гэтага прадпрыемства, пілсудчыкі, пасля руска-японскай вайны, ў 1906 г. разам з лідэрам польскай партыі соцыялістаў (ППС) доктарам Іодко ўвайшлі ў пагадненне з аўстрыйскім генеральным штабам для арганізацыі шпіянажа супроць Расіі.

Заняцце шпіянажам супроць Расіі не перашкаджала, аднак, некаторым пілсудчыкам і дзеячам польскага нацыяналізма быць адначасова і на службе ў царскай разведкі. На жалаванні рускага генеральнага штаба ў час першай сусветнай вайны быў, паміж іншым, вядомы пазней, польскі сенатар Рабскі, віднейшы генерал пасляваеннай Польшчы і адзін з польскіх дзеячаў, займаўшы ў 1923 г. пост міністра.

Прыйшоўшы да дзяржаўнай улады, пілсудчыкі шырока выкарысталі, накоплены імі за доўгія гады службы ў замежных разведках, шпіёнска-правакатарскі вопыт на новым для сябе попрышчы. Імкнучыся забяспечыць сабе панаванне, як у дзяржаўным апараце, так і ва ўсіх галінах палітычнага, гаспадарчага і грамадскага жыцця Польшчы, кіраўніцтва пілсудчыны ўсюды расставіла сваіх прадстаўнікоў.

Гэта старанна падабраная і добра законспіраваная агентура з ліку членаў ПОВ (Польская ваенная арганізацыя), ППС (Партыя польскіх соцыялістаў), былых легіянераў і г. д. пранікла ва ўсе грамадскія і палітычныя арганізацыі Польшчы.

Замежныя разведкі не менш шырока выкарысталі ў сваіх інтарэсах „разведвальнае мінулае" многіх палітычных і ваенных дзеячаў Польшчы, завербаваўшы іх да сябе на службу.

Разлажэнне і корупцыя ў польскіх кіруючых сферах прынялі такія размеры, што аб гэтым загаварылі нават некаторыя органы буржуазнай прэсы. У артыкуле „Хворае сумленне", апублікованым з вялікімі цэнзурнымі выемкамі ў газеце „Пяст", мы чытаем наступнае:

„Хоць у нас больш многалікія, чым у іншых дзяржавах... кар анныя і хатнія зладзеі, начныя і іншыя грабежнікі, яны, аднак-жа, не з'яўляюцца той язвою якая падточвае ўвесь арганізм. Гэта язва — зладзейства і ашуканства грамадзян, карыстаючыхся пашанай, і чыноўнікаў, надзеленых шырокай уладай... Ніводная галіна дзяржаўнага кіраўніцтва не свабодна ад гэтай язвы.

Ваяводствы, староствы, самакіраўніцтвы школьная справа, пошта, чыгункі, інтэнданцтва, дабрадзейнасць, дзяржаўныя маёнткі і прадпрыемствы, — адным словам, усе часці грамадскага арганізма заражаны зладзействам".

Такі твар нядаўных кіраўнікоў Польшчы.

В. Мінаеў
(„Правда")

*) Маркс і Энгельс, творы, том XXIII, стар 147.

не было асветных устаноў для народа. Совецкая Беларусь мае 1512 дамоў культуры, клубаў, хатчытален і іншых палітыкаасветных устаноў. Няма той вёскі або пасёлка, у якіх не было-б Дома соцкультуры, хаты-чытальні, няма той рабочай ні грамадскай арганізацыі, якая не мела-б сваёй культурнай установы.

Вялікі размах набыло ў нас дашкольнае выхаванне.

Партыя і ўрад акружаюць дзяцей клопатамі з першых жа дзён іх жыцця. Так, яшчэ ў 1937 годзе 253,600 дзяцей БССР знаходзіліся ў пастаянных і сезонных яслях. Шырока пастаўлена ў нашай рэспубліцы дашкольнае выхаванне дзяцей. У дадзены момант у нашай рэспубліцы ёсць 995 дзіцячых садоў, у якіх выхоўваецца 47,500 рэбят. Вялікая сетка дзіцячых пляцовак разгорнута ў калгасах і соўгасах.

Беларуская работніца і сялянка атрымалі поўную магчымасць займацца грамадска-карыснай дзейнасцю, а дзеці ў дашкольных установах атрымліваюць сапраўды грамадскае выхаванне.

Адным з буйнейшых поспехаў нашай краіны з'яўляецца стварэнне новай народнай соцыялістычнай інтэлігенцыі. Ні адна дзяржава не можа абыйсціся без інтэлігенцыі, тым больш не можа абыйсціся без сваёй інтэлігенцыі соцыялістычная дзяржава рабочых і сялян.

Для таго каб будаваць соцыялістычную дзяржаву, трэба як мага больш культурных сіл.

Людзі навукі, тэхнікі, культуры, мастацтва высока падняты ў краіне соцыялізма, бо наша грамадства ўвасабляе прагрэс, ажыццяўляе самыя перадавыя ідэі, самыя смелыя дзярзанні чалавецтва. У рэзультаце перамог ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі народы нашай краіны стварылі сваю літаратуру, свой тэатр, свае кадры совецкай інтэлігенцыі.

Армія інтэлігенцыі Совецкай Беларусі налічвае ў сваіх радах дзесяткі тысяч чалавек. У пераважнай большасці гэта ўчарашнія рабочыя і сяляне, сыны рабочых і сялян, высунутыя на камандныя пасты.

З усёй вастрынёй стаіць пытанне аб ідэйным выхаванні нашай совецкай інтэлігенцыі.

У наш час нельга быць толькі тэхнікам, толькі педагогам. Марксісцка-ленінская тэорыя — вось верны компас жыцця. Валодаць гэтым компасам абавязан кожны наш работнік, незалежна ад яго прафесіі або спецыяльнасці.

Велізарныя дасягненні ў нашай краіне сталі магчымы дзякуючы таму, што арганізатарам, натхніцелем усіх нашых перамог з'яўляецца найвялікшы чалавек нашай эпохі — дарагі і любімы правадыр народаў таварыш Сталін. Пад яго кіраўніцтвам вялікі совецкі народ высока падняў сцяг прагрэса, сцяг культуры, сцяг Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна.

Е. І. Уралава,
Народны камісар асветы БССР.

—:::—

Вітаюць Чырвоную Армію

Гэтымі днямі адбыўся агульны сход сялян Варнянскай воласці. На сходзе прысутнічалі звыш 2 тыс. чалавек.

З вялікай актыўнасцю прайшоў першы сход без польскай шляхты і чыноўнікаў панскай Польшчы.

Тут прысутнічалі працоўныя ўсіх нацыянальнасцей: беларусы, палякі, яўрэі, літвіны. Усе яны дружна абмяркоўвалі пытанні свайго жыцця.

Радасна і з гордасцю сустрэлі ўдзельнікі схода паведамленне аб тым, што яны поўнапраўныя гаспадары і самі будуць выбіраць сваю ўладу. Доўга грымелі воклічы і апладысмэнты ў чэсць сваей вызваліцельніцы — Чырвонай Арміі, у чэсць вялікага правадыра таварыша Сталіна.

На гэтым сходзе быў выбран сялянскі камітэт з 7 чалавек, які прыступіў ужо да работы.

Буцько.

—:::—

Прыступілі да раздзелу панскай зямлі

БАРАНАВІЧЫ. Дваццаць год мы жылі пад пятой панскіх катаў, якія здзекваліся над намі. Паны не лічылі беднякоў за людзей. Сялянам трэба было апрацоўваць пану зямлю, малаціць збожжа, вазіць дровы, касіць і звозіць сена для панскай жывёлы. Мала таго — на нас, беднякоў, накладаў польскі ўрад вялікія падаткі.

З выключнай радасцю сустрэлі мы Чырвоную Армію, якая вызвала нас ад панскіх здзекаў.

17 верасня ў нашай вёсцы арганізаваўся сялянскі камітэт. Але гэты камітэт праз 2—3 дні быў перавыбран, бо ў яго залезлі слугі польскіх паноў. Другі раз мы выбралі ў Сялянскі камітэт 12 чалавек — людзей чэсных і праверaных.

У камітэт увайшлі, Раман Равяка, Павел Азімна, Осіп Кацэлярчык, Канстанцін Пляскацэвіч і іншыя.

Баявы, работаздольны камітэт дружна ўзяўся за работу. Сялянскі камітэт чуецца ў вёсцы гаспадаром і арганізатарам.

Уся панская маёмасць узята на ўчот, пастаўлена каля яе варта. Беднякам і батракам камітэт раздаў 15 панскіх кароў. Кароў атрымалі Юліян Вераіса, Рыгор Пілецкі, Ніна Плудоўская і іншыя.

Павел Адамавіч
Казель
Старшыня Сялянскага камітэта вёскі Малышы, Мядзведзянскай воласці.

ПАСТАНОВА

Часовага Упраўлення г. Вільно ад 28. IX. 39 г.

Аб парадку набора рабочай сілы і ўплаце сум па страхавым адлічэнням.

1. Прапанаваць ўсім прамысловым, ганлёвым прадцрыемствам і ўстановам набор рабочых выгваравць толькі праз Біржу працы.

2. Абавязаць усіх уласнікаў і кіраунікоў прадпрыемстваў і устаноў у 3-дзённы тэрмін, з дня апублікавання гэтай пастановы, поўнасцю унесці ўсю запазычанасць па страховым узносам і ў далейшым уплату рабіць своечасова.

Асобы, якія будуць ухіляцца ад уплаты страхавых узносаў, будуць прыцягвацца да адказнасці.

Старшыня Часовага Упраўлення г. Вільно

Я. А. Жылянін

—:::—

Параход „Піонер" зняты з камней і прыбуксіраван у Кранштадт

ЛЕНІНГРАД. 2 кастрычніка (ТАСС). У Галоўным Упраўленні чырвонасцяжнага Эпрона атрымана паведамленне аб тым, што 29 верасня эпронаўцы балтыйскай экспедыцыі знялі з камней параход „Піонер". Як вядома, совецкі параход „Піонер", атакаваны 28 верасня невядомай падводнай лодкай пры ўваходзе ў Нарвскі заліў, быў вымушан выкінуцца на камні ў раёне банкі Вігрунд. 30 верасня выратавацель Эпрона „Сігнал" прыбуксіраваў параход „Піонер" у Кранштадт.

—:::—

Тыражы выйгрышаў у кастрычніку

У кастрычніку адбудуцца 2 тыражы выйгрышаў дзяржаўных унутраных пазык СССР.

10 кастрычніка у горадзе Горкім адбудзецца восьмы тыраж выйгрышаў дзяржаўнай унутранай выйгрышнай пазыкі 1938 г. Будзе разыграна 11.360 выйгрышаў на суму 7.668.800 рублёў.

У Растове-на-Дану 23 — 24 кастрычніка адбудзецца 3-ці тыраж пазыкі „3-цяй Пяцігодкі" (выпуск першага года). У гэтым тыражы будзе разыграна 610.000 выйгрышаў на суму 96.050.600 рублёў.

(ТАСС).

—:::—

Па Совецкаму Саюзу

< Кіеўская кіностудыя атрымала ад групы апаратараў кінокадры, заснятыя ў Заходняй Украіне. Зроблен экземпляр першага экстранага выпуска хронікі. На экране будзе паказан горад Львоў, вастор жаная сустрэча часцей даблеснай Чырвонай Арміі насельніцтвам Заходняй Беларусі.

< Ленінградскі грамафонны завод зрабіў вопытныя узоры партатыўных камбінаваных патэфонаў. Яны маюць акрамя пружыннага завода — электразаводную сістэму, працуючую ад мясцовай сеці. Палепшана і сама канструкцыя. Вага новых патэфонаў у параўнанні з „ПТ-3" менш на 1 клгр.

< У Самусьскім затоне (бліз Томска) пабудаван буксірны параход „Анатолий Серов", які праходзіць зараз прыёмачныя выпрабаванні. Да пуска на ваду рыхтуецца таксама параход „Полина Осипенко".

Праследванне компартыі ва Францыі

Французскія газеты паведамляюць аб вобысках і канфіскацыі дакумантаў у памяшканнях усіх арганізацый компартыі, якія пачаліся ў першую-ж ноч пасля вынясення французскім урадам рашэння аб роспуску компартыі.

(ТАСС)

—:::—

Антываенныя настроі ва Францыі

БЕРЛІН, 1 кастрычніка (ТАСС). Германскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: „З Парыжа паступаюць весткі аб усё больш растучай хвалі антываенных настрояў. Не гледзячы на намаганні французскіх улад і залежачага ад іх друку не ўдаецца запэўніць народныя масы Францыі ў неабходнасці цяперашняй вайны. Ва ўсей Францыі ўзмоцнена працуюць грамадзянскія ваенныя суды, якія асуджваюць людзей за антываенны настрой. Ужо вынесены тысячы прыгавараў над людзьмі, якія не разумеюць чаму французскі народ павінен весці вайну.

Чацьвертая парыжская судовая камера вынесла звыш 600 прыгавараў за крытыку знешняй палітыкі ўрада і за антываенную прапаганду. Сярод яшчэ не разабраных спраў у гэтай камеры знаходзіцца справа супроць 6 рабочых, якія распаўсюджвалі антываенныя лістоўкі. Усё больш расце незадавальненне французскай палітыкай і сярод прадстаўнікоў каланіяльных народаў. Так, напрыклад, у Парыжы мела месца судзебнае следства супроць араба Алі Шабан—рэдактара арабскай газеты. Алі Шабан прадстане перад ваенным судом, бо ён сваімі антываеннымі настроямі, па думцы французскіх прысяжных, пагражаў недатыкальнасці французскай тэрыторыі і аўтарытэту Францыі". Таксама чацьвертая судзебная камера прыгаварыла рабочага аднаго ваеннага завода да двух год турмы і 2 тысячы франкаў штрафа за тое, што ён у майстэрні сказаў свайму таварышу, што не трэба ваяваць за капіталістаў.

Нягледзячы на праследванне, антываенная агітацыя ва Францыі з кождым днем прымае усё больш адкрытыя формы. Паўсюду можна бачыць лістоўкі з патрабаваннямі спыніць вайну. Лістоўка пад загалоўкам: «Неадкладны мір» распаўсюджвалася па ўсёй Францыі.

—:::—

На заходнім фронце

ПАРЫЖ, 2 кастрычнка (ТАСС). Агенцтва Гавас перадае па радыё, што на фронце наземныя аперацыі спыніліся. Агенцтва тлумачыць гэта неабходнасцю для французаў замацавацца на новазанятай мясціне. Адначасова ўказваецца на значную актыўнасць авіяцыі. „Паміж іншым, — паведамляе агенцтва, — учора над баявымі пазіцыямі была адзначана найбольшая паветраная аперацыя з пачатку вайны. Адбыўся сапраўдны паветраны бой, у якім удзельнічалі дзве ці тры эскадрыллі". Аб рэзультатах гэтага боя агенцтва не паведамляе.

ЗА РУБЯЖОМ

Друк прыбалтыйскіх краін аб пакце ўзаемнай дапамогі паміж СССР і Эстоніяй і германа-совецкім дагаворы аб дружбе

РЫГА, 1-га кастрычніка (ТАСС). Латвійскі друк адводзіць многа месца дагавору аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй і пакту аб узаемадапамозе паміж СССР і Эстоніяй. Перадавы артыкул „Праўды" перадрукаван амаль усімі газетамі. Газеты асабліва адзначаюць трываласць міра створанага ва Усходняй Еўропе гэтымі дагаворамі. Так, газета „Яунакас Зіняс" друкуе вытрымкі з артыкула „Праўды" пад загалоўкам „Совецкі Саюз поўнасцю прызнае суверэнітэт Балтыйскіх дзяржаў", газета „Рытс" адзначае ў сваім перадавым артыкуле, „што СССР і Германія канчаткова прышлі да пагаднення аб граніцы, аб міру і аб парадку на тэрыторыі, дзе сустракаюцца іх інтарэсы. Дагавор з Эстоніяй забяспечвае мір на берагах Балтыйскага мора. Для забеспячэння міра на захадзе, калі будзе патрэбна, будуць прыцягнуты другія дружаственныя дзяржавы".

У паведамленні газеты „Брыва Земе" з Берліна гаворыцца: „Балтыйскія дзяржавы могуць смела глядзець у будучыню".

ХЕЛЬСІНКІ 1-га кастрычніка (ТАСС). Талінскі карэспандэнт „Хельсінгін Санамат" паведамляе, што ўчора на працягу ўсяго дня на імя прэзідэнта эстонскай рэспублікі бесперапынна паступалі тэлеграмы і пісьмы, у якіх прадстаўнікі розных колаў насельніцтва выражалі задавальненне Совецка-Эстонскім дагаворам.

Гаспадарчыя колы Эстоніі мяркуюць, што новы гандлёвы дагавор з СССР значна ажывіць эканамічнае жыццё ў Эстоніі. Недахоп сыравіны за апошні час стварыў пагрозу для эстонскай прамысловасці. У найбольш цяжкім становішчы аказаліся шкляныя і цэлулозныя прадпрыемствы, пазбавіўшыяся з-за ваенных дзеянняў рынка збыта на Захадзе.

Ужо зараз прыкметна ажывіліся гандлёвыя адносіны з Совецкім Саюзам. Лічаць, што гандлёвы зварот Эстоніі з СССР да канца бягучага года ўзрасце да 39 мільярдаў крон, тады як у прошлым годзе ён складаў 9,6 мільёнаў крон.

—:::—

Балгарскі друк аб палітыцы СССР

СОФІЯ, 1 кастрычніка (ТАСС). Балгарскія газеты друкуюць ва ўчарашніх нумарах газет перадавы артыкул газеты „Правда", суправаджаючы яго загалоўкамі: „Совецкі Саюз і Германія жадаюць, каб крывавы меч вайны быў укладзен у нажны". Газеты падкрэсліваюць месца ў перадавым артыкуле, дзе гаворыцца, што новы дагавор СССР з Германіяй з'яўляецца яшчэ адным бліскучым сцвярджэннем палітыкі міра, паслядоўна цверда і шчыра праводзімай Совецкім Урадам. Газеты выдзяляюць асабліва тыя месцы перадавога артыкула „Правды", дзе гаворыцца, што зброяй варожасці была у прыватнасці нежыццездольная, жыўшая грабяжом чужых зямель Польшча. Усе газеты асабліва падкрэсліваюць заяву „Правды", што Совецкі Саюз уважліва і беражліва адносіцца да незалежнасці і суверэнітэта малых краін, што Германія разам з СССР прыкладае усе намаганні для спынення вайны і ўстанаўлення міра. Газеты ў перадавых артыкулах пад загалоўкам „Новыя факты і перспектывы" пішуць: „Новая згода паміж Германіяй і СССР і дагавор паміж СССР і Эстоніяй з'яўляюцца фактамі надзвычайна важнага гістарычнага значэння і разгортваюць новыя перспектывы для далейшага развіцця падзей. Вайна ў Еўропе закончана. СССР, не захапіўшы ні пядзі польскай зямлі, звярнуў захопленныя раней Польшчай Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну ў іх бацькаўшчыну. Гэта адказвае этнаграфічна асаблівасцям украінскага і беларускага народаў, якія цяпер зажывуць вольным нацыянальным, соцыяльным і культурным жыццём. Прысутнасць часцей Чырвонай Арміі на граніцы ад Карпат да Літвы будзе пры ўсіх умовах мець вялікае значэнне для захавання міра і нейтралітэта дзяржаў Паўднёва-Усходняй Еўропы".

—:::—

Водгукі ў Іране на заключэнне германа-совецкага і совецка-эстонскага пактаў

ТЭГЕРАН, 2 кастрычніка. (ТАСС) Усе тэгеранскія газеты прыводзяць поўныя тэксты совецка-германскага дагавора, а таксама совецка-эстонскаго пакта і прысвячаюць цэлыя старонкі паведамленням аб маскоўскіх перагаворах. Паведамленні даны пад загалаўкамі, у якіх падкрэсліваецца ўзросшая роль СССР у еўрапейскіх справах.

—:::—

„Сіньхуашыбао" аб мірнай палітыцы Совецкага Саюза

ЧУНЦЫН, 2 кастрычніка (ТАСС). Газета „Сіньхуашыбао" ў перадавым артыкуле піша: „Мірная палітыка СССР заключаецца не толькі ў тым, каб абараняць усеагульны мір, але таксама і ў тым, каб дапамагаць слабым і прыгнечаным нацыям. Совецка-эстонскі дагавор аб узаемадапамозе з'яўляецца яркай сведкай гэтаму. СССР становіцца аплотам усеагульнага міра ў выніку дасягненняў велізарнейшых поспехаў у сваёй знешняй палітыцы".

Прамова прэзідэнта Эстоніі Піятса.

ТАЛІН, 1 кастрычніка (ТАСС). Прэзідэнт рэспублікі К. Піятс выступіў 29 верасня па радыё з прамовай, якая апублікавана сёння ўсімі эстонскімі газетамі. „Эстонія, — заявіў Піятс, — мае цвёрдае жаданне не ўмешвацца ў спрэчкі і барацьбу паміж вялікімі дзяржавамі. Яна аб'явіла аб сваім строгім нейтралітэце, і мы павінны звярнуць асаблівую ўвагу на тыя абавязацельствы, якія ад гэтага вынікаюць. „Пакт аб узаемадапамозе не закранае нашых суверенных праў. Наша дзяржава застаецца самастойнай, такой, якая яна была і да гэтага часу. Заключэнне пакта абазначае, што Совецкі Саюз праяўляе ў адносінах да нас сваю дабрадзейнасць і аказвае нам сваё падтрыманне як у эканамічнай, так і ў ваеннай справе. Я думаю, што такое рашэнне пры цяперашнім ваенным становішчы ў Еўропе, дае лепшыя доказы таго, што абедзве ўмаўляючыяся дзяржавы здолелі вырашыць складаннае пытанне так, каб не праліць ні кроплі чалавечай крыві.

У патрабаванні СССР не было нічога незвычайнага. Улічваючы гісторыю нашай дзяржавы і нашага геаграфічнага і палітычнага становішча, становіцца ясным, што мы павінны былі ўступіць у згоду з СССР. У якасці прыбярэжнай дзяржавы мы заўсёды былі пасрэднікамі паміж Захадам і Усходам. Гэта роль надала асобую ахварбоўку ўсей нашай культуры і нацыянальным пачынанням. Перагаворы гэтыя закончыліся падпісаннем пакта аб узаемадапамозе і былі сапраўды раўнымі перагаворамі, у якіх выслухоўвалі і ўлічвалі значэнне і прапановы абодвух бакоў".

У канцы сваёй прамовы прэзідэнт падкрэсліў, што заключаны пакт з'яўляецца важнейшым сродкам, забяспечваючым мірнае супрацоўніцтва эстонскага народа і народаў СССР.

—:::—

Новы прызыў у англійскую армію

ЛОНДАН, 2 кастрычніка (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ўчора вечарам каралём падпісана распараджэнне, па якому ўсе мужчыны — англійскія падданыя, якія знаходзяцца на 1 кастрычніка ў Англіі і дасягнуўшыя к гэтаму часу ўзроста ад 20 да 22 год, прызываюцца для службы ў англійскую армію.

У выніку гэтага распараджэння ў армію будзе прызвана 250 тысяч чалавек. З гэтага ліку каля 8 тыс. чалавек будзе прызвана ва флот і 14 тысяч у ваенна-паветраны флот.

Адказны рэдактар І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Вялікі попыт на совецкія кнігі ў г. Вільно

Горад Вільно налічвае звыш 15 бібліятэк, грамадскіх, публічных і прыватных.

Адной з найбольшых бібліятэк з'яўляецца бібліятэка „Мефіцэй Гаскаха" (па-дрэўнеяўрэйску „Пашыральнікі Асветы"). Яна знаходзіцца на рагу Завальнай і вуліцы Страшуна. Бібліятэка гэта абслугоўвае 1500 чытачоў. Персанал яе складаецца толькі з двух чалавек: загадчыка тав. Ф. Краснага і бібліятэкара Шапіро.

У цяперашні час кніжны актыў бібліятэкі — 50.000 томаў, не лічачы архіва ў 25.000.

Бібліятэкар т. Шапіро расказвае:

— З прыходам у Вільно часцей Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, вельмі ўзрос попыт на рускія, а асабліва на совецкія кнігі.

Да 1935 года бібліятэка сістэматычна папаўнялася совецкімі кніжнымі навінкамі. Попыт на іх быў вялікі, але труднасці ў атрыманні совецкіх кніг узрасталі з кожным днём.

Тав. Красны расказвае:

— Для таго, каб узбагачаць бібліятэку совецкімі кніжнымі навінкамі, адну і тую-ж кнігу прыходзілася адначасна выпісваць цераз пасрэдніцтва некалькі кніжных фірмаў, бо ў некаторых выпадках адзін чыноўнік польскай цэнзуры канфіскаваў даны том, а другі яго прапускаў, і кніга, такім чынам, пападада на кніжны рынак.

Для таго, што кніжныя пасылкі з Чэхаславакіі не падвяргаліся настолькі строгай цэнзуры, як з Рыгі, т. т. Красны і Шапіро звярталіся ў пражскае торгпрэдстава, і нейкі час атрымоўвалі совецкія кнігі для сваіх чытачоў.

З 1937 года нават і гэты мінімальны прыток совецкіх кніжных навінак зусім спыніўся.

У лютым 1939 г. польскія ўлады зрабілі ў бібліятэцы вобыск і канфіскавалі цэлы рад совецкіх кніг на польскім і яўрэйскім мовах. Выпадкова ўцалелі толькі совецкія выданні на рускім языку.

— Польскія „шпікі" прамаргалі, — заўважае бібліятэкар.

Тав. Шапіро не паспевае абслужваць наведвальнікаў.

— Дайце мне, калі ласка, „Как закалялась сталь" Астроўскага — просіць малады хлапец.

На працягу 18 гадоў пры бібліятэцы існавала чытальня. У апошнія годы яна была скасавана таму, што давала... дэфіцыт.

Цяпер палажэнне змянілася.

У Совецкім Саюзе такіх дэфіцытаў не ведаюць і, трэба спадзявацца, што ў нас іх таксама ведаць больш не будуць.

Ф. Кагановіч.

Паведамленне

5 кастрычніка г. г. ў памяшканні кінотэатра „Марс" (Вялікая вуліца) ў 16 гадзін па мясцомаму часу, Аддзел Культуры і Народнай Асветы Часовага Упраўлення г. Вільно склікае сход усіх настаўнікаў горада.

Аддзел Культуры і Народнай Асветы Часовага Упраўлення

4 кастрычніка, у 3 гадзіны дня у памяшканні союза чыгуначнікаў (Кіевская, 27) адбудзіцца сход рабочых металістаў.

Просьба на сход з'явіцца ўсім і без спазнення.

Праўленне саюза.

Адрас рэдакцыі і друкарні: вул. Епіскопа Бандурскага 4. Тэл. 79 і 99.